Зацвярджаю
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі
Брэсцкага аблвыканкама
________ А.Ф.Жук
« 04 » ________ 2018 г.

Пісьмовая работа (дыктант) па беларускай мове
для ўступнага экзамену ў X клас кадэцкага вучылішча

**Варыянт 2**

**Легенда пра Свіцязь**

Пра Свіцязь існуюць розныя легенды. Адна з іх такая.

Нібыта на гэтым узвышшы некалі стаяў непакорны горад. Жыхары яго больш за жыццё любілі волю. Неаднойчы чужынцы-прышэльцы выпрабоўвалі моц нашых продкаў, ды кожным разам вярталіся ні з чым. Аднаго разу на горад напала вельмі ж ваяўнічая зграя ворагаў. Усе мужчыны сталі абаронцамі і загінулі ў той няроўнай схватцы. Іх жанчыны, якія адразу засталіся ўдовамі, звярнуліся да Бога з адзінай малітвай: “Уратуй нас, Божа, ад навалы”. Яны так плакалі, што са слёз утварылася цэлае возера. Кажуць, над горадам павіс густы туман, сярод яго з’явіўся святы архангел Міхаіл у чорным плашчы. Ён благаславіў жыхароў горада на вечнае жыццё. На месцы паселішча ўтварылася возера Свіцязь, і паплылі па ім у памяць людзей чорныя кветкі.

І цяпер на возеры растуць рэдкія вадзяныя краскі, якія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. (137 слоў)

Паводле У.Ліпскага

---

Зграя – *перан.*, банда, шайка.